## Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у маі

**2 мая. Мікашевіцкая г.б.** Для ўдзельнікаў клуба "САМИ" прайшла літаратурна-гульнявая праграма "Мир, труд, май – читай и созидай», прысвечанае **святу працы**.
**5 мая. ЦБ.** Бібліятэку наведаў вядомы пісьменнік, кінадраматург, доктар юрыдычных навук, член Саюза пісьменнікаў Расіі і Беларусі Сяргей Трахімёнак. Сяргей Аляксандравіч падарыў бібліятэцы сваю новую кнігу "Восточный вектор" з аўтографам.

У бібліятэках прайшлі патрыятычныя мерапрыемствы і акцыі, урокі мужнасці, тэматычныя літаратурныя вечары, прысвечаныя **80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**
**2 мая. ЦБ.** У бібліятэцы адбылася 4-ая сустрэча духоўна-патрыятычнага праекта "Эхо нашей памяти", які рэалізуе цэнтральная раённая бібліятэка і рэдакцыя газеты "Лунінецкія навіны". Чарговая праграма была прысвечана воінам, якія вызвалялі горад Лунінец і Лунінецкі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Актыўны ўдзел у праграме прынялі навучэнцы 8 "Д" класа. *(Лунінецкія навіны. 2025. №34. 8 мая. С.14)*
**6 мая. ЦБ.** Адбылася сустрэча працоўнага калектыву бібліятэкі з адвакатам юрыдычнай кансультацыі Тамарай Грыцкевіч. Гутарку-размову "Подвигу народа жить в веках" прысвяцілі 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Адвакат расказала прысутным пра подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, аб ролі Перамогі ў жыцці кожнага беларуса і аб важнасці захавання гістарычнай памяці. Тамара Аляксееўна падзялілася ўспамінамі, звязанымі з удзелам членаў яе сям'і ў ваенных дзеяннях, і аб тым, як у іх сям'і шануюць памяць аб удзельніках Вялікай Айчыннай вайны.
**9 мая. ЦБ. ЦДБ.** На гарадскім святе для жыхароў горада была арганізавана інтэрактыўная бібліятэчная пляцоўка "Салют и слава годовщине навеки памятного дня", на якой былі аформлены кніжна-ілюстраваныя выставы "Наша Победа. День за днем», «Детство, опалённое войной», «Шагнувшие в бессмертие», выстава артэфактаў часоў Вялікай Айчыннай вайны «Здесь память о войне…». На пляцоўцы была арганізавана літаратурна-музычная кампазіцыя «Сквозь года звенит Победа». Удзельнікі народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Литературная провинция" і вучні СШ №4 яшчэ раз нагадалі аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, якім вялікім коштам была заваявана Перамога.
Для дзяцей была арганізавана дзіцячая гульнявая зона «Игровой привал».
**6-11 мая. ЦДБ**. Прайшоў Тыдзень памяці «Нам этот мир завещано беречь». У рамках Тыдня для вучняў школ горада Лунінца адбылася патрыятычная эстафета «Читаем стихи о войне".
**7 мая. Мікашевічская г.б**. Для навучэнцаў СШ №2 прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «В наших сердцах этот подвиг бессмертен».

**8 мая. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшоў вечар памяці «Іх подзвіг жывы, непаўторны, вечны». Удзельнікі клуба “Вдохновение” філіяла ТЦСАН г.Мікашэвічы чыталі вершы пра вайну рускіх і беларускіх паэтаў, успаміналі аб падзеях і людзях, звязаных з вайной. Госць мерапрыемства Сяргей Пятровіч Высоцкі расказаў аб прэзентацыі кнігі Валерыя Старжынскага “Дорогами памяти”, якая адбылася 7 мая у Нацыянальнай бібліятэцы. Кніга змяшчае раней невядомыя факты гісторыі нашай краіны, у прыватнасці аб ваенных падзеях у Брэсцкай вобласці і Лунінецкім раёне.
**9 мая. Мікашевічская г.б.** Супрацоўнікі бібліятэкі прынялі удзел у гарадскім свяце. Інтэрактыўная пляцоўка бібліятэкі ўключала разнастайныя акцыі, пазнавальна-забаўляльныя праграмы для дзяцей і дарослых. Былі прадстаўлены кніжныя выставы «Эхо ушедшей войны», тэматычны фотаальбом “Память о прошлом», выстаўка малюнкаў на ваенную тэматыку. Дзяцей запрасілі на эрудыт-віктарыну “Что я знаю о войне”, майстар-класс «Солдатский треугольник».

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Міжлесскай с.б.** прайшоў цыкл мерапрыемстваў: пазнавальная вандроўка «Знать, чтобы помнить», гадзіна-пазнанне «Герои Отечества — наши земляки», прайшла акцыя “Книгу как хронику боя, как летопись чувств перечтем». Бібліятэкар **Рэдзігераўскай с.б**. **6 мая** правяла экскурсію па помніках і месцах баявой славы «Маршруты памяти». Разам з навучэнцамі школы і старажылам в.Манасеева Лукашэвічам Уладзімірам Іванавічам наведалі брацкую магілу в.Сітніцкі Двор, магілу невядомага салдата і “Партызанскую вёску”. **7 мая** бібліятэкар **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клуба** сумесна з пачатковай школай правялі урок-вандроўку к помніку загінуўшых воінаў «Они сражались за Родину». Таксама ў бібліятэцы прайшла акцыя «Звезда памяти». Вучні 4 класа разам з педагогамі сталі часткай важнай падзеі, замацавалі к зорке памятную стужку. **9 мая** у **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** была закладзена капсула памяці будучым нашчадкам каля помніка загінуўшым воінам. Выкрыццё капсулы пройдзе на 100-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**14 і 15 мая** ў ГДК адбылася прадстаўленне тэатралізаванай літаратурна-музычнай кампазіцыі «И вспомнить страшно, и забыть нельзя”. Сцэнарыстам і рэжысёрам пастаноўкі з’яўляецца дырэктар ГУК “Лунінецкая РЦБС” І.А. Лецка. У ролі акцёраў выступілі супрацоўнікі цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі, удзельнікі аб’яднання па інтэрэсах “ПроТеатр” (кіраўнік О.В. Шарэнда) УО “Лунінецкі дзяржаўны палітэхнічны каледж”, удзельнікі народнай літаратурна-паэтычнай студыі “Литературная провинция”. Музычныя нумары гучалі ў выкананні работнікаў бібліятэчнай сістэмы, а яркім дапаўненнем кампазіцыі сталі танцавальныя нумары, прадстаўленыя танцавальным калектывам «Полесские задоринки” ГУО «Детская музыкальная школа искусств аг.Полесский». *(Лунінецкія навіны. 2025. 21 мая. С. 4)*

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Міжнароднаму дню сям’і**.

Бібліятэкі раёна прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Вместе за крепкую и здоровую семью».

**15 мая. Мікашэвіцкая г.б.** Адбылася гадзіна духоўнасці “Моя семья - мое богатство” для ўдзельнікаў клуба “Чамучка”. Дзеці ўзгадалі народныя прыказкі аб сям’і, адгадалі загадкі, расказалі пра свае сямейныя традыцыі і прынялі ўдзел у віктарынах, гульнях і конкурсах.

Таксама ў бібліятэцы адбылася сямейнае свята «Семья – это Мы!» з удзелам членаў клуба маладых інвалідаў «САМИ» Мікашэвіцкага філіяла Лунінецкага ТЦСАН.

**15 мая. ЦДБ.** У рамках праекта «Детская библиотека-детский сад-школа-семья» адбылася сямейная экскурсія ў дзіцячую бібліятэку «Семейному чтению – наше почтение».

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Любычынскай** с.б. прайшла тэматычная гадзіна «Семья – это дом, семья – это мир», у **Бродніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшла гадзіна зносін “Традиции нашей семьи”, у **Азярніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе – літаратурная гадзіна «Книжная мудрость – семейное богатство», у **Вулькаўскай-2** с.б. – урок дабрыні «Семья – это любовь», у **Міжлескай** с.б. – гутарка-дыялог «Любимые сайты моей семьи».

Прайшлі мерапрыемствы да **Сусветнага дню памяці ахвяр СНІДу.** З мэтай прыцягнення цікавасці грамадства да праблем распаўсюджвання хваробы і доступу да інфаріацыі аб гэтай хваробе ў бібліятэках на працягу тыдня праходзіла інфармацыйная акцыя “Чырвоная стужачка”.

**18 мая. ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі пра значэнне гэтага дня, пра тое, як ён дапамагае павысіць дасведчанасць аб СНІД і падтрымаць тых, хто пацярпеў ад гэтай хваробы. Былі агучаны апошнія дадзеныя аб колькасці захварэлых і памерлых ад СНІДу ў свеце. Удзельнікі актыўна абмеркавалі важнасць талерантнасці і падтрымкі людзей, якія жывуць з ВІЧ-інфекцыяй.

**21 мая. ЦБ.** У бібліятэцы прайшла прэзентацыя кнігі «Забвения не будет: брестские сёстры Хатыни». Гэта кніга сумесны праект Брэсцкага аблвыканкама, абласной газеты “Зара” і пракуратуры Брэсцкай вобласці. Кніга змяшчае матэрыялы аб вёсках Брэсцкай вобласці, знішчаных немецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады вайны. У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні Мікалай Іванавіч Вячорка і навучэнцы СШ №1 г. Лунінец. Мікалай Іванавіч расказаў аб трагедыі вёскі Сітніцкі Двор Лунінецкага раёна. У рамках мерапрыемства прысутныя паглядзелі відэа “Несожженная память. Ситницкий Двор».

Прайшлі мерапрыемствы да **Сусветнага дню без тытуню**. Так, **30 мая** ў **ЦРБ** прайшла стрит-акция “Мы говорим курению – нет!”, у **Бродніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе правялі пазнавальную гадзіну “Курить – не модно”, у **Дварэцкай с.б**. – урок здароўя “Курение – опасное увлечение», у **Міжлескай** с.б. – гутарка-дыялог “Курить – здоровью вредить», у **Палескай** с.б. – інфармацыйная гадзіна “Курение – опасное увлечение”, **31 мая** ў

**Ракітненскай с.б.** прайшла гутарка-парада “От сигареты откажись”, у **Сінкевіцкай с.б.** – урок інфармацыі “Сигнал опасности» і інш.

Плаўсюк 4 82 52